КРЫВІНКА

ВЕРАСЕНЬ
№13 (221)
2018 год

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА

НАША ЖЫЦЦЁ

ВЫКАРАНЯЕЦЦА МОВА

1-га верасьня ў васьмі школах Бешанковіцкага раёна, якія засталіся пасля праведзенай «аптымізацыі», распачаўся новы навучальны год. Сёлета не прагучаў званок у Вярхоўі. Вярхоўская СШ, якая пасьпела пабыць год ці два базавай, перастала існаваць.

Каранеўская школа таксама згубіла гордае імя «сярэдняя». Цяпер яна мянуецца «Каранеўская дзіцячы садбазавая школа». Прычым першы яе складнік — дзіцячы сад (24 дзіцяці) — не нашмат саступае самой школе, дзе ў сямі класах будзе вучыцца 32 вучні. У трэцім і шостым класах у школе вучняў наогул няма.

Тым ня меньш, гасьцей у школе сёньня было шмат. Віншавалі дзетак, настаўнікаў і бацькоў прадстаўнікі раённага аддзелу адукацыі, райвыканкаму і сельскага савету. Гучалі стандартныя фразы: "посьпехаў у вучобе, павысіць адзнакі". Усе зычылі «фінансового благополучія» настаўнікам.

Зразумела, уся праграма і ўсе выступленьні ў школе з беларускай мовай навучаньня былі выключна па-расейску. «Сапсавала» праграму сваёй шчымлівай песьняй пра нялёгкі лёс беларускай мовы настаўніца, якая яе выкладае, Святлана Мікалаеўна Власенка. Песьня прагучала рэзкім дысанансам усім выступоўцам, ды тое мала хто заўважыў.

У нашай школе, нашым раёне, нашай краіне сёньня робіцца ўсё, каб беларуская мова гучала выключна на ўроках беларускае мовы. Усе пазашкольныя мерапрыемствы вядуцца па-расейску. Гэта супадае з галоўным вектарам палітыкі ў Менску.

Вось і сёньня ў вусны тых, хто стаў першакласнікамі пасьпяхова ўклалі расейскія вершыкі. Яны пакуль што з беларускім вымаўленьнем, але нічога, настаўнікі рускай мовы выправяць іх і накіруюць на правільны шлях.

Так для маленькіх беларусаў распачалася першая сустрэча з раўнапраўем дзьвюх моваў. Пазьней, на ўроку беларускай мовы, іх пазнаёмяць і з беларускімі вершыкамі, але глыбока ў іхнюю душу яны не западуць. Для іх, маленькіх беларусаў, стане зразумела, што на беларускай мове ў іхняй школе не размаўляюць. Мусіць, так трэба. І яны будуць такімі, як усе.

А ці трэба калечыць гэтых дзетак? Ці трэба, каб з іх аніхто ня выйшаў патрыётам роднага краю? Каб яны не стварылі новых песень у скарбонку сваёй культуры, не сьпявалі нашых спрадвечных, пра якія сёньня амаль што ўсе забыліся.

Хаця, кажуць, што Беларусь можна моцна любіць і па-расейску, то-бок з расейскай мовай у вуснах. А прызнаньне ў любові да роднага краю на чужой мове гучыць нават лепш.

А мо найлепш адразу па-нямецку? Прыслухайцеся толькі: «Ich liebe dich, Belarus!»

Г.Станкевіч

ВІНШУЕМ!

ВЫЙГРАЎ «ШКОДУ РАПІД»

Аляксандр Маскаленка са Старых Ранчыц перамог у розыгрышы прызоў па выніках рэкламных гульняў, якія праводзіць «Беларусьнафта», у жніўні 2018 года.

Штомесяц "Беларусьнафта" праводзіць розыгрыш прызоў сярод сваіх кліентаў. Трэба толькі карыстацца картай лаяльнасьці і зарэгістраваць яе ў інтэрнэце. Налічаныя балы можна ставіць на розыгрышы аўтамабіляў.

У жніўні пашанцавала нашаму земляку, які выйграў суперпрыз - аўтамабіль «Шкода Рапід».

Першы прыз, аўтамабіль Skoda Kodiaq (красовер), выйграў жыхар Маладзечна.

М.Васільеў

****

Алюмініевы тазік дзіравага неба
месцамі ўжо пазеляне́ў
ад старасьці,
але ўсё яшчэ рэгулярна
пасылае нам
то дождж, то сьнег,
то наогул якую-небудзь брыдоту.
Але чамусь аніводнага разу піва!

Так шкада аматараў
гэтага напою!
Уяўляю, як бы радавалася
іхняе нутро,
калі б аднойчы
нябесны кельнер расшчодрыўся,
і (няхай бы і без
папярэдняй аб'весткі)
адкаркаваў на хвілінку
свае бяздонныя бутлі
бурштынавага трунку.

Але ж, калі мне
ўяўляецца акаселы заяц,
які сьмела йдзе насустрач
такому ж касому дварняку,
каб выпіць на брудэршафт,
мая раптоўна забрадзіўшая
піўная фантазія
ўмомант ападае,
нібы пена ў піўным кухлі.

А таму: няхай жыве
безалкагольны дождж!

Г.Станкевіч

ПРАБЛЕМЫ ВЁСКІ

МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

Сёлета на Віцебшчыне размеркавана 215 спецыялістаў сельгаспрофілю. Самыя запатрабаваныя прафесіі — заатэхнік і ветэрынарны ўрач. Найбольшую патрэбу ў спецыялістах сельгаспрофілю адчуваюць Бешанковіцкі, Браслаўскі, Сенненскі, Талачынскі, Ушацкі і Шумілінскі раёны.

Больш за 200 выпускнікоў ВНУ ўліліся ў працоўныя калектывы аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці. Сенненскі раён адносіцца да рэгіёнаў, у якіх патрэба ў спецыялістах на вёсцы адна з самых высокіх. У гэтым годзе сюды размеркаваліся 19 выпускнікоў аграрных ВНУ і каледжаў. Чацвёра з іх спасцігаюць асновы прафесіі ў гаспадарцы «Дружбінец».

Прадпрыемства размешчана ў аграгарадку Нямойта - жывой, дагледжанай вёсцы за 10 кіламетрах ад райцэнтра. Марына Пшэвальская, якую накіравалі ў гаспадарку працаваць заатэхнікам-селекцыянерам, лічыць такі варыянт не горшым:

- Я сама з вёскі, праўда, яна побач з абласным цэнтрам. Сельскі побыт мяне дакладна не палохае. Прафесію выбірала не выпадкова. Вядома, на практыцы ўсё больш складана. Фермы далёка адна ад адной, і гэту адлегласць даводзіцца штодня пераадольваць. Гэта, бадай, адзіная нязручнасць. Ды і нязвыкла толькі спачатку. З жывёлаводамі агульную мову знайшла хутка. Людзі разумеюць, што ад сумесных намаганняў залежыць эканоміка гаспадаркі, а значыць, і нашы зарплаты. Малако - галоўная крыніца даходу, таму трэба прырастаць не толькі колькасцю, але і якасцю. Пакуль аналізую, вывучаю прадуктыўныя магчымасці жывёл.

Дзяўчына паступіла ў акадэмію пасля каледжа. Падчас вучобы займалася верхавой яздой ў конным клубе. У Нямойце пакуль такой магчымасці няма, ды і часу вольнага застаецца няшмат. Гаспадарка аплачвае маладому спецыялісту здымны пакой, бытавымі ўмовамі Марына задаволеная. У сваёй ідэальнай будучыні дзяўчына бачыць добраўпарадкаваны дом з гародам, садам, гаспадаркай і абавязкова конікам. Дзе ён будзе - не загадвае, але ўпэўненая, што абавязкова будзе.

У цеснай звязцы з Марынай працуе яе малады калега Аляксандр Маслоўскі. У яго такая ж спецыяльнасць, але ён на пасадзе брыгадзіра вытворчай брыгады жывёлаводаў. Хлопец родам з невялікай вёсачкі Калінава пад Віцебскам. Мама працуе садоўнікам, а ён марыў стаць аграномам, як дзядзька. Паступіць на аграномічнае аддзяленне ў каледжы не хапіла балаў, і яму прапанавалі падаць на заатэхнію. Як і Марына, працягнуў навучанне ў акадэміі. Хлопец таксама ня засмучаны размеркаваннем:

- На практыцы мне пашчасціла пазнаёміцца з высокатэхналагічнай вытворчасцю ў гаспадарцы «Мазалавагаз», дзе ўсё рабатызавана. Тут усё інакш, але калектыў добры, кіраўніцтва ставіцца да нас з увагай і разуменнем.

Службовы домік з Аляксандрам дзеліць яшчэ адзін малады спецыяліст Уладзіслаў Кончын. Каля месяца таму ён быў прызначаны загадчыкам майстэрнямі. Скончыў Гарадоцкі аграрны каледж. Улад мае няпросты лёс: застаўся сацыяльным сіратой, 5 гадоў жыў у прыёмнай сям'і ў суседняй вёсцы Баравікі. Вучыўся ў мясцовай школе, многія аднакласнікі працуюць у гэтай гаспадарцы. У планах атрымаць вышэйшую адукацыю.

- Прыйшоў у разгар жніва, таму з першых дзён прыйшлося сур'ёзна ўнікаць ва ўсе тонкасці, часу на разварушванне няма, - распавядае хлопец. - Сур'ёзных непаладак не было, складаныя пытанні з рамонтам дапамагалі вырашаць інжынер і дырэктар. Планую атрымаць завочна вышэйшую адукацыю, але спачатку хачу стаць на ногі, зарабіць грошай. Ды і адцягвацца на вучобу ў час палявых работ складана.

У вёсцы жыць і працаваць можна, але хацелася б лепшых умоў у плане інфраструктуры. Вось мы з хлопцамі любім займацца спортам, у нас ёсць брусы і турнік ў доме, а ў вольны час ездзім у ФАК ў райцэнтр. Аграгарадок, здаецца, і блізка да горада, а дабрацца цяжка. Аўтобусы ходзяць вельмі рэдка. Дапамагае уласны аўтамабіль, але не ва ўсіх ён ёсць. Цэны на прадукты значна вышэй, чым у горадзе, ды і выбар сціплы, а даходы ў вяскоўцаў ніжэй. Зняць з карткі грошы можна толькі на пошце. У астатнім усё задавальняе, калектыў памяркоўны, ды і людзі ў вёсцы добрыя, простыя.

Кіраўніцтва ускладае на моладзь вялікія надзеі. Многія заводзяць тут сям'і і застаюцца, гэта выклікае аптымізм. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Сяргей Мяцеліца растлумачыў, што раён зацікаўлены ў замацаванні на сяле перспектыўных і мэтанакіраваных кадраў. Іх праблемы не застаюцца без увагі, у вёсках стараюцца стварыць умовы для рэалізацыі прафесійнага патэнцыялу, а таксама для арганізацыі вольнага часу. У аграгарадку Нямойта якраз вырашаецца пытанне з Домам культуры, які часова зачынены. Ва ўстанове шукаюць прыдатную кандыдатуру загадчыка.

"СБ"

КУЛЬТУРА

НА ФЕСТЫВАЛІ Ў РУМЫНІІ

Народны ансамбль народнай песні «Весялуха» быў створаны ў 1990 годзе. Яго кіраўніком і душой доўгія гады з'яўлялася Зінаіда Насыр, таленавітая і ўлюблёная ў творчасць жанчына. Пасля раптоўнай смерці Зінаіды Пятроўны ў 2014 годзе калектывам стала кіраваць Ірына Паўлоўская.

- Да майго прыходу ансамбль ужо быў папулярны ў раёне, таксама яго запрашалі на гастролі па вобласці і рэспубліцы, - сказала Ірына Ігараўна. - Каб і ў далейшым заставацца запатрабаванымі, амаладзілі склад удзельнікаў, адкарэктавалі рэпертуар і імідж. У прыватнасці, з'явіліся рэканструяваныя мясцовым майстрам касцюмы і новыя песні, характэрныя для нашага рэгіёну.

Касцяк «Весялухі» - 20 самадзейных вакалістаў і музыкантаў, якія ў вольны ад асноўнай працы час рэпетуюць і выступаюць. Разнастайнасць жанраў і забіяцкая энергетыка ансамбля не пакідаюць абыякавымі гледачоў ад малога да вялікага і дзівяць журы розных праектаў. Толькі ў апошнія гады артыстаў-аматараў з Бешанковічаў высока ацанілі на прэстыжным конкурсе «Калядныя сустрэчы" ў Мінску і фестывалі нацыянальных культур у Гродне, а таксама ў Прыбалтыцы. Апошнім на сёння дасягненнем стала паездка ў румынскую Бістрыцю на XXIII Міжнародны фестываль фальклору «Nunta Zamfirei» («Вяселле Земфіры»).

- Заяўку адправілі разам з іншым прадстаўніком нашага РЦК - калектывам бытавых танцаў «Кружалі». Разам з намі на этапе нацыянальнага адбору за права выступіць у Румыніі змагаліся калегі з Гродна і Асіповіч, але ў выніку запрашэнне ад арганізатараў дасталася нам.

У гістарычную Трансільванію з'ехаліся артысты з 13 краін. На працягу трох дзён беларусы імкнуліся здзівіць сваім майстэрствам замежнікаў. Мяркуючы па водгуках як простых гледачоў, так і прафесіяналаў, ім гэта ўдалося. Асабліва ўразіла гучанне шумавых нацыянальных інструментаў - трашчотак і цымбалаў.

Нягледзячы на напружаны графік выступаў і падрыхтоўкі да іх, дэлегацыя Беларусі здолела патрапіць на прыём да дырэктара фестывалю Даролу Косма, агледзець славутасці старадаўняга горада і пабываць на магіле графа Дракулы. Але самае галоўнае - нашы землякі завязалі новыя кантакты з калегамі з іншых краін, абмяняліся з імі вопытам і пазнаёміліся з рознымі культурамі. Дадому народны ансамбль народнай песні «Весялуха» і ансамбль бытавых танцаў «Кружалі» вярнуліся з цікавым прапановай.

- Адным з самых прыемных момантаў для нас стала запрашэнне ў наступным годзе ў Францыю на Міжнародны фальклорны фестываль. Засталося знайсці спонсараў гэтай паездкі, - паведаміла Ірына Ігараўна. - А ў арганізацыі гастроляў у Румынію нам дапамог старшыня райвыканкама Андрэй Булаўкін і кіраўніцтва СТАА «Націвіта».

"Віцебскія весці"

ЗДАРЭННІ

ДТЗ НА МОСЦЕ

7-га верасня а 10-й гадзіне вечара на мосце праз раку Вула, што ляжыць каля Бачэйкава на аўтадарозе Мінск — Віцебск, адбылося дарожна-транспартнае здарэнне.

Мост праз раку Вула рамантуецца, і рух праз яго абмежаваны. Месца звужэння дарогі абазначана ліхтарамі, якія даюць вельмі слабое святло.

Магчыма таму вадзіцель фуры з літоўскімі нумарамі, які ехаў з боку Віцебска, не разабраўся ў сітуацыі. Каб спыніцца, яму прыйшлося прабіць усе бардзюры, якімі было абазначана месца рамонту моста, і нават парэнчы моста. На гэтых парэнчах машына павісла над ракой.

Сам вадзіцель, малады хлопец гадоў 25, пашкоджанняў не атрымаў.

А. Тутэйшы

ЗНАЙШЛІ ЗІНАІДУ БАГДАНАВУ

5-га верасня ў лесе непадалёку ад крынічкі, што за бальніцай, знайшлі Багданаву Зінаіду Васільеўну, 86 гадовую пенсіянерку, якая прапала 30-га чэрвеня 2018 года.

Вядома, што ў гэты дзень каля 13-00 яна сышла з тэрапеўтычнага аддзялення Бешанковіцкай ЦРБ. Праз некалькі дзён былі арганізаваныя пошукі, якія не далі вынікаў. Хаця пашукавікі ведалі, што яна пайшла ў бок Ржаўкі, і яе шукалі таксама ў гэтым лесе.

Зараз следчыя праводзяць апазнаванне чалавека, збіраюць доказы таго, што знойдзеная ёсць менавіта Багданава Зінаіда Васільеўна.

А.Тутэйшы

ВЯСКОВЫЯ ПРАБЛЕМЫ

БЛУКАННЕ ПА ПАКУТАХ

Сваё жыллё для шматдзетнай сям'і — гэта гарантыя стабільнасці і спакою за будучыню дзяцей. Так лічыць жыхарка пасёлка Бачэйкава Таццяна Амоненка — мама дарослай дачкі і траіх малалетніх сыноў.

Сем гадоў прайшло з таго часу, як яна разам з мужам Аляксандрам прыступіла да збору дакументаў на ўзвядзенне катэджа, пяць - з моманту старту будаўнічых работ. Вось толькі доўгачаканае наваселле паранейшаму далёка. І гэта нягледзячы на тое, што банк выдаў вяскоўцам льготны крэдыт. Чаму?

Жыццё на прыродзе

Да жаніцьбы Аляксандр жыў у Мінску. Таццяна - у Віцебску. Пазнаёміліся выпадкова, доўга размаўлялі. А праз паўтара года выраshылі ажаніцца. Саша перабраўся ў Віцебск, і неўзабаве маладыя вызначыліся - трэба з'ехаць далей ад шумнага горада і ўладкавацца на зямлі. Зараз Таццяна распавядае:

- Гэта было цалкам усвядомленае рашэнне. Мы хацелі мець шмат дзяцей, свой уласны сад, вялікую гаспадарку. Звярнуліся ў цэнтр занятасці, нам знайшлі месца. Так восем гадоў таму і прыехалі сюды, у сельгаспрадпрыемства ААТ «Бешанковіцкі аграсэрвіс». Нам выдзелілі службовае жыллё. Муж пайшоў працаваць, а я пакуль сядзела ў дэкрэтным адпачынку з малодшым Аляксандрам - яму было ўсяго два гадкі. Ужо тады мы разумелі: ведамасная жылплошча - часовы варыянт. Яе дзецям не пакінеш, ды і залежаць ад працадаўцы ў гэтым плане не хацелася. Таму адразу вырашылі - трэба будавацца. Сельсавет дапамог падабраць участак. Так, каб побач з домам быў максімальна вялікі зямельны надзел, бо ўжо тады пачыналі абзаводзіцца жыўнасцю ...

Пад новабудоўлю выбралі пляцоўку ў суседняй ад Бачэйкава вёсцы Клешчыно. Усё, як планавалі - месца ціхае, адасобленае. Удалечыні ад шумных дарог. Зямлі дастаткова. Доўга думалі над праектам дома і адрыны. Малявалі самі, потым падключылі праекціроўшчыкаў. На паперы дом быў гатовы, а для рэальнага ўвасаблення ідэі ў жыццё спатрэбіліся, вядома ж, грошы. Да таго часу ў сям'і ўжо з'явіўся другі сын - Валадар. Старэйшай дачкі (ад першага шлюбу Таццяны) яшчэ не было васемнаццаці, так што сям'я змагла прэтэндаваць на льготны крэдыт. Сабралі дакументы, звярнуліся ў банк. Там нібыта і параілі падрадчыка - прыватную фірму, якая раней ужо ўзводзіла дом для адной са шматдзетных сем'яў раёна.

Хлеў з камфортам

Грошай як такіх, сцвярджаюць Амоненкі, яны ў руках не трымалі. Першы транш у суме 365 мільёнаў рублёў (недамінаваных) банк пералічыў па іх заяве адразу падрадчыку. А той узяў і ... знік на паўгода. І на званкі адказваць перастаў. Шукалі. Па словах Таццяны Мікалаеўны, разам з райвыканкамам і банкам. Знайшлі. Дырэктар фірмы даслаў супрацоўнікаў, якія падрыхтавалі, нарэшце, «падушку» пад падмурак. Потым работы на будпляцоўцы ізноў былі спыненыя на некалькі месяцаў. А калі аднавіліся, начальства загадала працоўным займацца ўжо не домам, а адрынай. Таццяна успамінае:

- Мы з Сашам вельмі баяліся, што крэдыту на дом не хопіць - усё даражэе. Прасілі падрадчыкаў у першую чаргу будаваць дом - хлеў для жывёлы не галоўнае. Але кіраўнік фірмы настаяў на сваім. Цяпер, як бачыце, скаціна жыве з камфортам. У адрозненне ад нас ...

Хлеў для жыўнасці і напраўду атрымаўся добрым. Усе месяцца - тры казы, невялікі статак в'етнамскіх свінак, качкі, гусі, індакачкі, куры ... Была і карова, але яе прыйшлося прадаць, каб на атрыманыя грошы ўжо самастойна працягваць будаўніцтва дома.

Падрадчык з горам напалову паспеў выкласці сцены катэджа, часткова уладкаваў фасад, абтынкаваў памяшканне ўнутры, усталяваў ацяпляльнае абсталяванне, падвёў ваду, зрабіў каналізацыю і заявіў: усё, грошай больш няма. У недабудаванае жыллё і хлеў для скаціны было ўкладзена на «старыя» грошы прыкладна 1,6 мільярда рублёў (!).

Амоненкі забілі трывогу. Сцвярджалі: на думку спецыялістаў, з якімі яны кансультаваліся, цэны моцна завышаныя. Плюс якасць работ не вытрымлівае ніякай крытыкі. Што і было пасля пацверджана дакументальна. Вось толькі будфірма адмаўлялася што-небудзь выпраўляць да моманту здачы дома ў эксплуатацыю. А як яго здасі, калі там патрэбны сур'ёзныя фінансавыя ўліванні, якіх зараз у сям'і няма? Прыйшлося шукаць падтрымку ў Камітэце дзяржкантролю і судах.

Я не я, і хата не мая

Доўгія хаджэнні па афіцыйных кабінетах, напісанне скаргаў і хадайніцтваў, адвакаты, камісіі і экспертызы ... У снежні мінулага года раённы суд вынес рашэнне аб тым, што будаўнічая фірма-падрадчык павінна выплаціць шматдзетнай сям'і 33 тысячы рублёў (ужо дэнамінаваныя) за невыкананне тэрмінаў работ і ліквідацыю дэфектаў, а таксама ў якасці кампенсацыі за маральныя страты і пені. Вось толькі ў самой фірмы, як гэта стала модна ў апошні час, ніякай маёмасці ў наяўнасці не аказалася. А яе заснавальнік па дакументах адказнасці за «праколы» свайго прадпрыемства не нясе ...

Што цяпер? У Амоненкаў, акрамя дзесяцігадовага Сашы і сямігадовага Валадара, ужо расце трохгадовы Ілля. Палова заработнай платы бацькі хлапчукоў, які на сёння з'яўляецца іх адзіным карміцелем, ідзе на пагашэнне крэдыту, выдадзенага банкам пад будаўніцтва жылля. У тым ліку і тых самых сродкаў, якія былі неправамерна спісаныя выканаўцам работ з рахункаў. Утрымацца на плаву сям'і дапамагаюць свая кі і ўласная падсобная гаспадарка. Колькі часу і сродкаў спатрэбіцца для завяршэння будаўніцтва? Складана сказаць, бо сёння руйнуецца ўжо тое, што было пабудавана - абвальваецца фасад, аўтаматыка няправільна устаноўленага катла выйшла са строю, шмат іншых недапрацовак. Спагнаць грошы з нядбайнага падрадчыка цяпер складана, судовыя выканаўцы вось ужо паўгода спрабуюць знайсці хоць нейкае рашэнне праблемы, а дакладней, маёмасць фірмы, але марна.

Атрымліваецца, шматдзетная сям'я апынулася ў крэдытнай пастцы. Чацвёртую зіму яна вымушана будзе ацяпляць два дамы, марнуючы на гэта немалыя сумы. Разрываецца паміж новай недабудаванай сядзібай, дзе ўтрымліваецца жыўнасць, і цяперашнім службовым жыллём (у чатырох кіламетрах), дзе жывуць самі. І збіраць капейкі на тое, каб падрыхтаваць да пераезду хаця б адзін пакой - на месцы, як ні круці, справа пойдзе хутчэй. Але сур'ёзны стрымліваючы фактар - трое малалетніх дзяцей. Яны да бытавых эксперыментаў ніяк не гатовыя ...

А. Вераск
"СБ"

БЕЛАРУСЬ – РАСІЯ

УЛЬТЫМАТУМ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Расія будзе турбавацца, перш за ўсё, пра сябе. Саюзніку і стратэгічнаму партнёру давядзецца разлічваць на ўласныя сілы і не чакаць падтрымкі.



Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін сустракаліся ў чэрвені — дзеля гэтага кіраўнік Расіі нават прапусціў матч сваёй зборнай з Егіптам на Чэмпіянаце свету па футболе. У ліпені Пуцін запрасіў беларускага калегу на сустрэчу. Той не ехаў амаль месяц, і ўрэшце выправіўся ў Сочы напрыканцы жніўня.

Варта звярнуць увагу на тое, што канкрэтнай інфармацыі па выніках гэтых рандэву — кату па пяту. Па выніках апошняй паездкі Лукашэнкі на пуцінскую яхту прэс-служба кіраўніка дзяржавы не рабіла ніякіх гучных заяў. Толькі праз тры дні Аляксандр Рыгоравіч даў маштабнае інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь-1».

Цалкам можа быць, што затрымка з інфармацыяй была адмысловым ходам: каб прыцягнуць да гэтага інтэрв'ю больш увагі. Але ж яно пакінула больш пытанняў, чым адказаў.

Многія заўважылі, што ці не ўпершыню Лукашэнка адказваў на пытанні журналістаў з паперкай — з гатовымі тэзісамі адказаў. Канешне, гэта звычайная практыка, калі кіраўніку такога ўзроўню спачатку дасылаюцца пісьмовыя пытанні, ён рыхтуе адказы і потым агучвае іх на камеру. Аднак гэта імкнуцца не афішаваць.

Апроч таго, ніякіх рэальных адказаў пра сустрэчу з Пуціным мы не атрымалі. Па сутнасці, інтэрв'ю выглядала апраўданнем беларускага кіраўніка за рэзкія словы, якія ён дазволіў сабе на адрас Расіі раней: «Без Расіі мы нікуды», «Мы — народы з аднаго кораня» і «Расія для Беларусі — анёл-абаронца». Але за салодкагалосай рыторыкай так і не было чуваць, што ж Лукашэнка і Пуцін абмяркоўвалі ў Сочы і чаму расійскі кіраўнік так доўга і ўпарта чакаў беларускага калегу.

Для таго, каб абмеркаваць кандыдатуру новага расійскага пасла? Гэта і аспрэчыў сам кіраўнік Беларусі, што было ці не адзіным сэнсоўным кавалкам яго размовы з тэлевізійшчыкамі.

Палітолагі і аналітыкі лічаць, што нешта на сустрэчы Лукашэнкі і Пуціна «не зраслося» і «не склеілася». Але, мяркуючы па настойлівасці і цярплівасці Уладзіміра Уладзіміравіча і па наступнаму інтэрв'ю Аляксандра Рыгоравіча, «зрастацца і клеіцца» там не было чаму.

Хутчэй за ўсё, кіраўнік Расіі агучыў «новую эканамічную палітыку» ў адносінах да Беларусі, якая палягае ў словах: «Вучыцеся выжываць самі». Санкцыі ЕС і ЗША моцна б'юць па расійскай эканоміцы. І, падаецца, яны ўжо перакрочылі тую мяжу, калі іх можна было «адкаціць назад». Раней іх прычынай была вайна ва Украіне, а зараз фінансавыя абмежаванні ўводзяцца з-за «справы Скрыпалёў» і расійскага ўплыву на выбары ў заходніх дэмакратыях.

Калі раней можна было вярнуць Крым Украіне і сказаць: «Выбачаемся», то атручаных замежных грамадзян з таго свету не вернеш.

Расіі патрэбныя грошы. Грошы на падтрымку ўладаў марыянетачных рэспублік ва Украіне, Расія загразла ў Сірыі — напрыклад, днямі з'явілася інфармацыя, што РФ накіроўвае дадатковыя сілы на базу ў Хмеймім (хаця яшчэ 11 снежня мінулага года Пуцін урачыста загадваў вывесці расійскія войскі з Сірыі). Плюс санкцыі — і грошай на падтрымку «сяброў» не застаецца. Больш за тое, завязаныя на расійскую эканоміку «сябры» непазбежна атрымаюць аддачу антырасійскіх санкцый па сваёй эканоміцы. Для Беларусі гэтая аддача можа быць вельмі і вельмі балючай.

Расія будзе турбавацца, перш за ўсё, пра сябе. Саюзніку і стратэгічнаму партнёру давядзецца разлічваць на ўласныя сілы і не чакаць падтрымкі (акрамя маральнай). «Падатковы манеўр» Расіі што да карысных выкапняў працягнецца, адзіная нафтагазавая прастора ў межах ЕАЭС — у аддаленай перспектыве, паліва для АЭС прыйдзецца набываць па нармальным кошце. Па ўнутрырасійскіх коштах нафту, газ і ўран могуць атрымаць толькі расійскія рэгіёны, так што калі хочаце — давайце да нас.

Думаю, што Пуцін выклаў усё гэта спакойным дзелавым тонам, абмаляваўшы сітуацыю, як яна ёсць. І ў якасці першага кроку падтрымкі прапанаваў прыняць пасла Бабіча з паўнамоцтвамі спецпрадстаўніка па эканамічных пытаннях. На што Лукашэнку заставалася толькі пагадзіцца.

Пагадзіцца — і думаць, што рабіць далей. Астатнія канкрэтныя пытанні, калі яны ўзніклі ў Пуціна, Аляксандр Рыгоравіч мог нівеляваць адным чынам: «Трэба параіцца з таварышамі, такія пытанні з кандачка не вырашаюцца». А «таварышы» яшчэ не ўвайшлі ў курс справы. Не выключаю, што нядаўнія маштабныя змены ва ўрадзе былі зробленыя Лукашэнкам не толькі «паслям Оршы», але і з перспектывай ухіліцца ад абмеркавання праблемных пытанняў у размове з расійскім кіраўніком.

Па выніках сочынскай размовы Лукашэнка сказаў, што наступная сустрэча з Пуціным пройдзе ў пашыраным складзе з кіраўнікамі ўрадаў. Меркавана, гэта адбудзецца ў Магілёве ў кастрычніку падчас V Форума рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Такім чынам, кіраўнік Беларусі ўзяў паўзу, каб асэнсаваць новыя рэаліі і паспрабаваць выпрацаваць адказ на новыя выклікі. Хаця месца для манеўра ў яго, падаецца, няшмат.

Сяргей Пульша
"Новы Час"

НАФТАВАЕ ПЫТАННЕ

НЯ ДУМАЕ АДМАЎЛЯЦЦА АД ПАДАТКОВАГА МАНЭЎРУ

Беларусь будзе плаціць за расейскую нафту, як і іншыя краіны... Кіраўнік падатковага дэпартамэнту Міністэрства фінанасаў Расеі Аляксей Сазанаў даў інтэрвію агенцтву Reuters, у якім сярод іншага расказаў пра падатковы манэўр у нафтавай галіне і абмежаваньні паставак нафтапрадуктаў у Беларусь.

Адказваючы на пытаньне пра супрацу зь беларускімі партнэрамі, Аляксей Сазанаў прызнаўся, што гэта «складанае пытаньне».

«Мы ў працэсе абмеркаваньня: ці будзе кампэнсацыя, у якім аб'ёме і якія інструмэнты пры гэтым выкарыстоўваць. Але ў любым выпадку гэта павінен быць мэханізм, калі ўсе будуць бачыць, якую суму штогод мы накіроўваем зь бюджэту Расеі на падтрымку Беларусі. Калі мы падавалі падтрымку ў выглядзе дыфэрэнцыялу ў мытах, ніхто гэтага нават ня бачыў, гэта было схаванае субсыдаваньне беларускай эканомікі».

Паводле расейскага чыноўніка, цяпер, калі праводзіцца манэўр, усё «ўсплывае» на паверхню, больш такога схаванага субсыдаваньня ўжо ня будзе. І запэўнівае, што ніякіх міжнародных пагадненьняў Расея пры гэтым не парушыла.

«Раней гэта было „шэрае поле", калі грошы губляў фэдэральны бюджэт Расеі, а атрымлівалі нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі. Цяпер адбываецца значнае „абяленьне" узаемаадносінаў у гэтай частцы, і гэта вельмі добра. Калегі кажуць, што мы несправядліва прынялі „сувэрэннае рашэньне". Аднак зьмена падатковага заканадаўства не рэгулюецца ў рамках пагадненьня аб Эўразійскім эканамічным саюзе. Гэта наша права вызначаць падатковы рэжым унутры краіны, і ў рамках гэтага права мы яго крыху падкарэктавалі».

Паводле Аляксея Сазанава, Расея на «братэрскіх стасунках» страчвала велізарныя сумы: пачынаючы ад сярэдзіны нулявых, гэта больш за трыльён расейскіх рублёў.

Пра абмежаваньні паставак нафтапрадуктаў

Беларусь мае прафіцыт па ўсіх нафтапрадуктах за кошт сваёй нафтаперапрацоўкі. Таму ёй выгадна закупляць расейскія нафтапрадукты — больш танныя з улікам таго, што ў Расеі сацыяльна-адказныя нафтакампаніі і кошты ніжэйшыя, чым экспартная альтэрнатыва, патлумачыў кіраўнік падатковага дэпартамэнту Міністэрства фінанасаў Расеі Аляксей Сазанаў.

«Пастаўляючы нафтапрадукты ў Беларусь, расейскі бюджэт недаатрымлівае экспартнае мыта, бо гэтыя нафтапрадукты ідуць на задавальненьне патрэб беларускага рынку. Па сутнасьці, гэта зноў прыхаваная форма субсыдаваньня цяпер ужо ўнутранага рынку краіны. Калі скончыцца манэўр у нафтавай галіне, такога ўжо ня будзе. Пакуль мы ставім пытаньне пра абмежаваньне паставак. Балянс гэты вызначае Мінэнэрга».

Як заявіў чыноўнік, з улікам падатковага манэўру размова можа ісьці пра аб'ёмы паставак ад 100 да 300 тысяч тон за год, але ніяк не пра 2 мільёны, як ёсьць на гэты момант. Паводле Сазанава, летась Расея страціла на такіх пастаўках 10 мільярдаў расейскіх рублёў, а сёлета аналягічную суму толькі цягам паўгодзьдзя.

Як паведамляла Свабода, у ліпені Дзяржаўная Дума Расеі прыняла законапраект аб паступовым скасаваньні мыта на вываз нафты — так званы падатковы манэўр. Гэта азначае, што беларуская эканоміка пазбавіцца вуглевадароднай «іголкі», на якой сядзела больш за 20 гадоў. Расейская нафта для Беларусі будзе каштаваць столькі ж, колькі і для іншых краінаў.

Беларусь зарабляе мільярды на экспарце нафтапрадуктаў

Згодна з дакумэнтам, цягам 2019–2025 гадоў Расея паступова зьнізіць экспартнае мыта на сваю нафту зь цяперашніх 30% да нуля. Адначасова павялічыцца падатак на здабычу гэтай сыравіны. Увынiку, адзначаюць экспэрты, Беларусь ня зможа перапрадаваць расейскія вуглевадароды.

Нават пры цяперашніх ваганьнях нафтавых цэнаў Беларусь выйграе да 2,5 мільярда даляраў за год, закупляючы яе ў Расеі — гэта прыкладна 5% працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.

З 24 мільёнаў тон расейскай нафты прыкладна 6 мільёнаў рээкспартуецца з нацэнкай у краіны Эўразьвязу. Большая частка з астатніх 18 мільёнаў тон пасьля перапрацоўкі ў Мазыры і Наваполацку таксама ідзе на замежны рынак. Усё гэта прыносіла значныя даходы. Але ад наступнага году нафтавыя субсыдыі пачнуць істотна «абразацца».

"Радыё Свабода"

КАРУПЦЫЯ

ФІНТ ВУШАМІ

Як у Міністэрстве аховы здароўя зьбіраюцца перамагчы карупцыю? Для барацьбы з карупцыяй патрэбен кантроль грамадзтва, а не стварэньне новых бюракратычных структур.

11 верасьня Аляксандар Лукашэнка на нарадзе аб праблемных пытаньнях у сыстэме аховы здароўя чарговым разам узгадаў тэму карупцыі ў ведамстве. «Карупцыя здараецца ўсюды, але ў ахове здароўя праблема стала ня кропкавай, а скразной, сыстэмнай. Яна закранула не асобных службовых асоб, а закранула практычна ўсю вэртыкаль», — сказаў кіраўнік дзяржавы. І запытаў міністра аховы здароўя Валерыя Малашко: «Вы мне так вось шчыра скажыце — вы здольны кіраваць міністэрствам?»

Але, гледзячы па ўсім, пасьля скандальных затрыманьняў у чэрвені, у сыстэме аховы здароўя мала што памянялася. Пра гэта сьведчыць скандальная гісторыя з закупам не зарэгістраванай у Беларусі карэйскай вакцыны «Эўпэнта». Пасьля яе прымяненьня памерлі двое дзяцей. Два аўкцыёны дзеля закупу вакцыны чамусьці не адбыліся, у выніку міністэрства купіла прэпарат, прычым не зарэгістраваны ў Беларусі, бяз конкурсу ў адной карэйскай фірмы.

Адразу ж пасьля нарады міністар Малашко, камэнтуючы дзяржаўным тэлеканалам захады, якія зьбіраецца рабіць дзеля барацьбы з карупцыяй, заявіў: «Сёньня мы павінны ўводзіць сыстэму і ўнутранай бясьпекі. Гэта ня столькі міліцэйскія функцыі, так скажам, колькі ў першую чаргу дасьведчаныя эканамісты, якія будуць кантраляваць сярэднеўзважаныя цэны на тую тэхніку, якая набываецца, лекавыя прэпараты, кантраляваць парадак правядзеньня тых ці іншых працэдур».

Гэта проста клясыка бюракратычнага фінту вушамі. Што трэба рабіць, калі ўзьнікла нейкая праблема? Адказ бюракрата, як правіла, заўсёды аднолькавы: трэба стварыць камісію. У дадзеным выпадку плянуецца арганізаваць у ведамстве новую структуру, якая павінна змагацца з карупцыяй. А калі яна ня ўправіцца з гэтай задачай — то стварыць новую структуру, якая будзе сачыць за першай? Гэта на дадатак да КДБ і іншых шматлікіх праваахоўных і кантрольных органаў. У рамках існай сыстэмы чыноўнік па-іншаму мысьліць проста ня можа.

Між тым мэтады барацьбы з карупцыяй у сьвеце добра вядомыя. Зьвярнуў бы ўвагу толькі на такія рэчы, як празрыстасьць, галоснасьць у дзейнасьці дзяржаўных органаў, а таксама кантроль з боку грамадзтва з дапамогай незалежных мэдыяў.

Але вось якраз гэта для беларускіх ведамстваў, у прыватнасьці для Міністэрства аховы здароўя, абсалютна непрымальна. Узгадайма тую ж гісторыю з карэйскай вакцынай. Як толькі часопіс «Ежедневник» апублікаваў расьсьледаваньне аб прычынах сьмерці дзіцяці ў Ганцавіцкім раёне пасьля прышчэпкі, то Мінздароўя зьвярнулася ў пракуратуру з патрабаваньнем пакараць журналістаў. Маўляў, «фармат падачы і грубае выкладаньне фактаў у артыкулах, апублікаваных на адным з інтэрнэт-рэсурсаў і перадрукаваных іншымі СМІ, могуць нанесьці шкоду нацыянальнай бясьпецы Рэспублікі Беларусь у сфэры аховы здароўя». То бок ня дзеяньні сыстэмы аховы здароўя, у выніку якіх паміраюць дзеці, наносяць шкоду нацыянальнай бясьпецы краіны, а тое, што пра гэта пішуць СМІ! Фэнамэнальная лёгіка.

Праз два дні пасьля публікацыяў пра гэты скандал з карэйскай вакцынай высокія чыноўнікі Міністэрства аховы здароўя запрасілі журналістаў, каб выказаць сваю пазыцыю. На брыфінг сабралася вялікая колькасьць журналістаў, яны мелі шмат пытаньняў. Аднак чыноўнікі міністэрства зачыталі па чарзе свае заявы і ўцяклі, адмовіўшыся адказваць на пытаньні прадстаўнікоў мэдыяў. Мусіць, ёсьць што хаваць?

Вось якраз непадкантрольнасьць грамадзтву, адсутнасьць зваротнай сувязі з насельніцтвам, закрытасьць і непразрыстасьць, незразумелая сакрэтнасьць і ствараюць глебу для карупцыі. І ніякая новая бюракратычная структура ў рамках ведамства па барацьбе з карупцыяй праблему ня вырашыць.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

ТАКАЯ АДУКАЦЫЯ

В 10-М КЛАССЕ НУЖНЫ ШЕСТЬ УРОКОВ ТРУДА?

В белорусские школы возвращается профессиональная подготовка. В учебный план 2018/2019 учебного года для учеников 10-х классов в школах, где все предметы изучаются на базовом уровне, введено трудовое обучение — шесть часов в неделю. Означает ли это возвращение советской системы УПК?

В профильных классах уроков труда не будет

Трудовое обучение по шесть уроков в неделю будет введено только для десятиклассников базовых классов. Для 11-классников это планируется со следующего учебного года (2019/2020). В этом году в выпускных классах такого предмета не будет.

Речь об освоении некоторых профессий, это не будут классические уроки труда, на которых мальчиков учат делать табуретки, а девочек — шить юбки.

Как сообщила на пресс-конференции 27 августа заместитель начальника главного управления общего среднего, дошкольного и специального образования, начальник управления общего среднего образования Министерства образования Ирина Каржова, перечень профессий, по которым будет осуществляться обучение, определяется с учетом запросов учащихся и возможностей школы.

В комментарии для Naviny.by пресс-секретарь Минобразования Людмила Высоцкая подчеркнула, что речь о том, что шесть часов в неделю трудом будут заниматься все школьники, не идет.

«В каждой школе, — пояснила Высоцкая, — могут создаваться профильные классы, дети в которых изучают определенные предметы на повышенном уровне. В таких классах не будет предмета „трудовое обучение". Такой предмет будет в базовых классах, которых в целом по стране больше, чем профильных».

Чтобы попасть в профильный класс, средний балл успеваемости у ученика должен быть не менее «6», а оценка по профильному предмету «7» и выше.

Профильное обучение вернули в школы в 2013 году. Система такого обучения создавалась с 2006 года, но была практически ликвидирована в 2008-м в связи с переходом с 12-летнего на 11-летнее среднее образование (это решение критики называли «антиреформой образования»). Тогда были сокращены часы на углубленное и дополнительное изучение профильных предметов.

Теперь профили есть в каждой гимназии, а в лицеи (не путать с профессиональными, бывшими ПТУ) дети поступают сразу по профилям и сдают соответствующие экзамены.

Как правило, если в школе два десятых класса, то один из них — профильный, но есть школы, где профильных классов нет.

С 2015 года в некоторых школах появились и профессиональные профильные классы — педагогические, военно-патриотические, правовые, обучение в которых направлено на подготовку к получению конкретных специальностей.

В прошлом году, например, педагогические классы функционировали в 23 учреждениях образования, где обучались 240 учащихся. Из них только каждому пятому дали рекомендацию для поступления в профильный педагогический вуз, а поступили туда около 16% от общего количества выпускников педклассов, причем больше половины — из одной гимназии.

В Минске есть школы, где в этом году десятиклассникам предложили два варианта обучения — базовый или педагогический класс.

Мама мальчика, который оказался в базовом классе школы № 6 (второй вариант был как раз педагогический класс), рассказала, что детям дали большой выбор специальностей на трудовом обучении.

«В перечне — делопроизводитель, исполнитель художественно-оформительских работ, мастер по маникюру, медицинский регистратор, дизайнер ландшафта, оператор ПЭВМ, официант, парикмахер, визажист, повар, слесарь по ремонту автомобилей и рабочий зеленого строительства. Список, вроде, и большой, но есть ограничения по состоянию здоровья, а в группах количество мест ограничено», — сказал она.

На каждую профессию каждой школе отведено определенное количество мест — одинаковое вне зависимости от спроса. Профессиональной подготовке будет отдан весь учебный день в среду. В субботу в расписании — обычные школьные предметы.

«В нашей школе дети и в прошлом году занимались трудовым обучением в виде профессиональной подготовки. Их ознакомили с несколькими профессиями. Не уверена, что в 10-м классе каждую неделю стоит терять целый школьный день, чтобы обучать детей специальностям, по которым не факт, что они будут работать», — сказала мама ученика.

Как отличить козу от коровы

Идея об увеличении количества часов трудового обучения, судя по всему, родилась не в кабинетах Минобразования. В августе 2017 года на Республиканском педсовете о недостатках системы говорил президент.

«Надо посмотреть, вернуться к тому, как это у нас было. У нас в школе мы работали на приусадебных участках. Мы обязаны были летом три недели или месяц проходить трудовое обучение, практику. Не везде это есть. Вот и доработались, что дети на селе не то что корову от быка — козу от коровы отличить не могут. Это же катастрофа», — возмущался Александр Лукашенко.

Вскоре после этого тогдашний заместитель премьер-министра Василий Жарко на совещании в Министерстве образования поставил задачу «повышать качество трудового обучения и воспитания в школе».

«Тех учебных часов в базовой школе, которые есть на сегодняшний день, явно недостаточно. Не говоря уже про 10-11-е классы, где эти часы на трудовое обучение вообще не предусмотрены. В Кодексе об образовании тоже не прописано трудовое обучение в старших классах. Этот вопрос надо продумать», — заявил Жарко.

Продумали так — если в школах нет возможности заниматься профобучением, оно будет проходить в учреждениях профессионально-технического или среднего специального образования, на базе вузов и учреждений дополнительного образования.

В Минобразования подчеркивают, что дети будут иметь выбор профессий. Это означает, что в учебно-производственных комбинатах и профессиональных лицеях прибавится работы, от чего, можно предположить, выиграют педагоги и мастера.

Но поможет ли введение трудового обучения для старшеклассников сориентировать их на продолжение образования в профессиональных лицеях, можно будет оценить лишь через год-другой. Пока же профлицеи испытывают хронические проблемы с набором учащихся, почти ежегодно объявляется дополнительный набор.

Например, в этом году в шести столичных лицеях был недобор на строительные специальности. Оставались места в колледже декоративно-прикладного искусства и в профессионально-техническом колледже строительства и коммунального хозяйства.

К слову, профессиональный лицей № 10 строительства план набора все же выполнил и станет в этом году базой для проведения уроков труда сразу для 25 школ Центрального и Московского районов….

Елена Спасюк
"БЕЛАПАН"

Заснавальнік і рэдактар: Станкевіч Георгій Мікалаевіч

Адрас рэдакцыі: Бешанковіцкі раён, в. Старыя Ранчыцы, e-mail: stan62@list.ru, тэл. 60237, маб. +375292184739
Газета выдаецца з сакавіка 2005г.

Падпісана да друку 16.09.2018 у 17.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на ўласным абсталяванні.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.